УДК 930

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ І ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939): МІЖВАЕННАЯ ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Цымбал Аляксандр Георгіевіч
дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму
ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны вывучэнню міжваеннай польскай гістарыяграфіі нацыянальнага пытання ў праваслаўнай царкве ў Заходняй Беларусі (1921–1939). Дадзеная праблема разглядалася гісторыкамі ў некалькіх аспектах: супрацьстаянне рускага, украінскага і беларускага элементаў, забеспячэння ўнутранай бяспекі польскай дзяржавы і абвяшчэння аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Польшчы.*

Праблема нацыянальнага характара Праваслаўнай царквы ў Польшчы была істотным элементам палітыкі ўлад адносна праваслаўя. Польская дзяржава атрымала Праваслаўную царкву амаль цалкам зрусіфікаванай. Выхаванне, адукацыя, навыкі шматгадовай, у тым ліку палітычнай, дзейнасці на карысць расійскага самадзяржаўя, перашкаджалі ўспрыняццю духавенствам змен, якія адбыліся пасля знікнення Расійскай імперыі. З цяжкасцю прымаўся святарамі факт узнікнення польскай дзяржавы, і цалкам адсутнічала разуменне працэсаў, якія адбываліся ў беларускім і ўкраінскім грамадстве. Пераважную частку вернікаў Праваслаўнай царквы ў Польшчы складалі беларусы і ўкраінцы, аднак клір праводзіў набажэнствы на царкоўна-славянскай мове з рускім вымаўленнем, карыстаўся рускай мовай ў пропаведзях, царкоўнай адміністрацыі, навучанні рэлігіі і ў кантактах з вернікамі. Змены становішча царквы ў Савецкім Саюзе таксама падштурхоўвалі ўрад да трансфармацыі царкоўных інстытутаў у польскай дзяржаве. Пытанне шырока абмяркоўвалася ў грамадскай сферы і прыцягвала ўвагу навукоўцаў. У сувязі з гэтым цікавым уяўляецца звярнуцца да даробку польскай міжваеннай гістарыяграфіі і разгледзець, як даследчыкі канцэптуалізавалі і інтэрпрэтавалі нацыянальнае пытаннеў Праваслаўнай царкве.

Цікавасць да разнастайных праблем «крэсаў усходніх» у міжваенны перыяд была выклікана найперш патрэбамі вызначэння нацыянальнай палітыкі польскага ўрада і неабходнасцю ўмацавання цэласнасці і бяспекі Польшчы. Вывучэнне нацыянальных меншасцей павінна было спрыяць выпрацоўцы канкрэтных механізмаў і шляхоў іх інтэграцыі ў польскую дзяржаву. Адпаведна канфесійная праблематыка разглядалася праз прызму вырашэння нацыянальнага пытання і ў цеснай сувязі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з ім. Характэрна, што ў пачатку 1920-х гг. у даследчыкаў гучалі дастаткова крытычныя ацэнкі польскай нацыянальнай палітыкі. Праблемы нацыянальна-рэлігійнага жыцця разглядаліся ў працах К. Сракоўскага, які ў сваім даследванні напісаным на замову польскага прэм'ера У. Сікорскага ў 1923 г., паказаў маніпуляцыі падчас перапіса насельніцтва 1921 г., што вялі да ўзнікнення вялікай групы праваслаўных палякаў, як апоры для будучай паланізацыі царквы. Ён прапаноўваў свой варты ўвагі аналіз вынікаў перапісу, які павялічыў колькасць палякаў амаль на 20% праваслаўных, бо з'явіліся палякі праваслаўнага веравызнання колькасцю каля 230 тыс., ці амаль 20% увогуле ўсіх палякаў у трох паўночна-ўсходніх ваяводствах. Непраўдападобна, паводле К. Сракоўскага, выглядала нацыянальна-канфесійная стукрура перапіса, калі беларусаў налічвалася менш чым праваслаўных, а палякаў больш чым католікаў [1, с. 5–6]. Аналізуючы ўплыў беларускага руху ў праваслаўнай царкве, аўтар адзначаў, што сярод праваслаўнага духавенства адсотак свядомых беларусаў быў ніжэй ці падобны, як і сярод каталіцкага. Выклікана гэта было русіфікатарска-паліцэйскімі функцыямі кліру з царскіх часоў, так і ўвогуле нізкім узроўнем адукацыі. Аднак адначасова падкрэсліваў, што паступовa зацвярджаецца пашырэнне беларускіх ідэй сярод праваслаўнага духавенства, што тлумачыў асаблівасцямі становішча праваслаўя ў Польшчы [1, с. 10].

У кірунку распрацоўкі праектаў вырашэння нацыянальнага пытання працаваў Інстытут дыследванняў нацыянальных спраў, які паўстаў у 1921 г. з мэтай навуковага вывучэння становішча нацыянальных мешнасцей, у першую чаргу ў Польшчы. Вынікі даследаванняў Інстытута з 1927 г. друкаваліся ў часопісе «Sprawy narodowościowe». Адзін з аўтараў выдання – М. Кавалеўскі, адмыслова звяртаў увагу на нацыянальнае пытанне ў Праваслаўнай царкве. Аўтар сцвярджаў, што сярод расійскіх дзеячаў менавіта царква ўспрымалася як захавальнік расійскіх імперскіх традыцый, што стала крыніцай для ўнутраных канфліктаў у царкве паміж іерархамі і вернікамі: беларусамі і, асабліва,украінцамі, якія патрабавалі ўліку іх нацыянальных інтарэсаў, увядзення нацыянальных моў у набажэнствы і казанні, вяртання да асноў сабарнасці і ўдзелу вернікаў у царкоўных справах. На баку апошніх выступіла ніжэйшае духавенства, якое паходзіла з мясцовага асяроддзя. У сваю чаргу Сінод праваслаўнай царквы, які складаўся з вышэйшых іерархаў рускага паходжання заняў негатыўную пазіцыю адносна гэтых патрабаванняў і спадзяваўся захаваць рускі характар царквы і яе русіфікатарскія функцыі. На думку аўтара, такая пазіцыя іерархаў пагражала расколам праваслаўя ў Польшчы, што супярэчыла інтарэсам праваслаўных вернікаў, Праваслаўнай царквы і польскай дзяржавы. М. Кавалеўскі заклікаў да ўмяшання дзяржавы ў вырашэнне нацыянальнага пытання ў царкве і задаваленне духоўных патрэб з улікам нацыянальных інтарэсаў украінцаў, беларусаў, рускіх і палякаў [2, с. 259–269].

Падобную пазіцыю займаў яшчэ адзін аўтар часопіса В. Любіч, які крытыкаваў пазіцыю мітрапалітаў Георгія і Дзіянісія, якія арганізоўвалі царкву ў Польшчы як царкву рускую і выступалі супраць увядзення саборных прынцыпаў і ўдзелу свецкага элементу ў кіраванні царквой. Адначасова яны не жадалі ўлічваць інтарэсы беларускага і нацыянальнага рухаў і мадыфікаваць царкву. Калі папулярнасць украінскага руху набывала сілу сярод духавенства Валыні і Галіцы, то, на думку аўтара, у беларускім руху ў царкве пытанні нацыянальнай ідэнтычнасці адыгрывалі мінімальную ролю, а на першы план выходзілі палітычна-ўтылітарныя аспекты. Рускае па паходжанні духавенства ў Заходняй Беларусі пачынала выдаваць сябе за беларусаў, апасаючыся застацца "пастырамі без авечак". Калі ўкраінскі рух у аснове сваёй быў антырасійскі (палітычна) і антымаскоўскі (царкоўна) і выступаў за шырокую ўкраінізацыю царквы, то беларускі рух у царкве, які ўзначальваў сенатар В. Багдановіч, уяўляў сабой кампрамісны варыянт з абмежаваным увядзеннем казанняў на беларускай мове і захаваннем падпарадкаваннем Маскоўскаму Патрыярху [3, с. 181–182].

Шэраг аўтараў разглядаліпраблему праз прызму аўтакефальнасці царквы. С. Пекарскі сцвярджаў аб неабходнасці адміністрацыйнай незалежнасці царквы ў Польшчы ад Патрыярха Маскоўскагаі праз гэта нівеліраванне расійскага ўплыву ў праваслаўі [4, с. 58–65]. Е. Лангрод абгрунтоўваў неабходнасць актыўнага ўмяшання дзяржаўных улад у вырашэнне праблемы праваслаўя ў Польшчы. Той факт, што нацыянальныя меншасці, якія ў асноўнай масе спавядалі праваслаўе і пражывалі ўздоўж усходняй мяжы, і знаходзіліся пад вялікім уплывам усходняга суседа, надаваў нацыянальна-канфесійнай праблематыцы выразнае палітычнае значэнне з перспектывы інтэграцыі ўсходніх тэрыторый Польшчы і ліквідацыі савецкай экспансіі. Першым крокам у гэтым кірунку аўтар разглядаў аўтакефалію, якая стварала ўмовы для вяртання да асноў саборнасці і наднацыянальнага адзінства царквы. Фундаментам вырашэння праблемы павінны былі быць польскія нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы [5, с. 11]. Прафесар Варшаўскага ўніверсітэта А. Латоцкі падкрэсліваў, што гісторыя праваслаўя – гэта гісторыя эмансіпацыі нацыянальна-царкоўных структур. Адпаведна кожная царква, якая дзейнічала на тэрыторыі пэўнага народу, павінна была дастасоўвацца да мясцовых умоў і адлюстроўваць характар і пажаданні гэтага народу [6, с. 132]. Законнасць і легітымнасць Польскай праваслаўнай аўтакефальнай царквы абгрунтоўваў і М. Зызыкін, які ў сваёй працы паказваў, што аўтакефалія павінна забяспечыць супадзенне нацыянальна-дзяржаўных граніц і царкоўнай арганізацыі, асабліва з улікам існавання атэістычнай савецкай улады, якая зрабіла немагчымым функцыянаванне Рускай праваслаўнай царквы [7, с. 120–125].

Яшчэ адзін аспект у якім разглядалася нацыянальнае пытанне ў праваслаўнай царкве, гэта была акцыя рэвіндыкацы праваслаўнай маёмасці на карысць Каталіцкага касцёла. Аўтар украінскага паходжання В. Касаноцкі ў сваім выданні прысвечаным рэвіндыкацыйным працэсам на Валыні і Палессі падкрэсліваў, што палітычныя колы нацыянальных меншасцей акцыю рэвіндыкацыі разглядалі ў якасці палітычнага і нацыянальна-рэлігійнага ўціску беларусаў і ўкраінцаў. Складаліся петыцыі ў Лігу Нацый, дзе азначаліся парушэнні польскімі ўладамі Канстытуцыі і палажэнняў Версальскага трактата па абароне правоў нацыянальных меншасцей у Польшчы [8, с. 11–12].

Такім чынам, нацыянальнае пытанне ў Праваслаўнай царкве прыцягвала ўвагу навукоўцаў, якія займаліся праблемамі інтэграцыі ўсходніх зямель міжваеннай Польшчы. Дадзеная праблема разглядалася ў некальках аспектах: супрацьстаяння рускага, украінскага і беларускага элементаў у царкве, супрацьстаяння з Каталіцкім касцёлам і палітыкі паланізацыі, забеспячэння ўнутранай бяспекі польскай дзяржавы і абвяшчэння аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Польшчы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K. Srokowski. – Kraków : Druk. «Czasu», 1924. – 56 s.
2. Kowalewskij, M. Spór narodowościowy w Cerkwi Prawosławnej w Polsce / M. Kowalewskij // Sprawy narodowościowe 1927. – Rok 1. – № 3. – S. 259 –269
3. Lubicz, W. Z zagadnień narodowościowych i ustrojowych Cerkwi Prawosławnej w Polsce / W. Lubicz// Sprawy narodowościowe 1928. – Rok 2. – № 2. – S. 169–190.
4. Piekarski, S. Wyznania religijne w Polsce / S. Piekarski. – Warszawa : M. Arcta, 1927. – 158 s.
5. Langrod, J. O Autokefalii prawosławnej w Polsce: studium z zakresu polskiej polityki i administracji wyznaniowej / J. Langrod. – Warszawa : Druk. «Bibl. Polska» w Bydgoszczy, 1931. – 170 s.
6. Łotocki, A. Autokefalia. Zasady autokefalii / A. Łotocki. – Warszawa : Inst. wydawiczy «Bibl. polska», 1932. – 216 s.
7. Zyzykin, M. Autokefalia i zasady jej zastosowania / M. Zyzykin. – Warszawa : Inst. wydaw. «Bibl. polska», 1931. – 128 s.
8. Процес за православні церкви. Справа так зв. ревіндікаційних судових процесів про передачу 724 православних святинь Римо-католицькому костелові. Частина перша Волинь і Полісся / Зібрав та опрац. В. Косоноцький ; ред. І. Кедрин. – Варшава: Видання Української Парляментарної Репрезентації, 1930. – 65 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова